Источник: "Краязнаўчая газета" - 2012-07-05

# На тым тыдні...

✓ **25 чэрвеня** ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі адбылася **Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Экалогія чалавека ў вырашэнні сацыяльных праблемаў мінулага і сучаснага грамадства»**. У яе рамках адбыліся прэзентацыя навукова-папулярнага выдання «Современная антропология», а таксама адкрыццё выстаўкі «Антрапалогія Беларусі ў кантэксце сусветных даследаванняў».

✓ **25 чэрвеня** ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь прайшла **прэзентацыя кнігі Андрэя Лукашэвіча «Памятники и памятные места 1812 года в Беларуси»**. У кнізе разглядаюцца пытанні ўвекавечання падзеяў вайны 1812 года на беларускіх землях, падрабязна паказаная гісторыя фартыфікаваных забудоваў і іншых памятных месцаў той эпохі. Выданне добра ілюстраванае (больш за 420 фотаздымкаў, з якіх больш за 160 – каляровыя).

✓ **26 чэрвеня** ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылося ўрачыстае **адкрыццё кніжна-дакументальнай выстаўкі-прагляду «У сэрцы з Радзімай»**. Сярод выданняў – энцыклапедычны даведнік «Хто ёсць хто сярод беларусаў свету», створаны ў адпаведнасці з Дзяржаўнай праграмай «Беларусы ў свеце» Нацыянальным навукова-асветніцкім цэнтрам імя Ф. Скарыны сумесна з грамадскім аб'яднаннем «Міжнародная асацыяцыя беларусістаў» пры падтрымцы Дзяржаўнага камітэта па справах рэлігіяў і нацыянальнасцяў, навукова-папулярнае выданне «Беларускае замежжа», выпушчанае Дэпартаментам па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь, «Паваенная эміграцыя: скрыжаванні лёсаў» – зборнік успамінаў 73-х прадстаўнікоў беларускай дыяспары, якія пасля 1944 года апынуліся ў Аргенціне, Аўстраліі, Бельгіі, Германіі, Францыі, Чэхіі і іншых краінах свету.

Асобнае месца ў экспазіцыі займаюць рэдкія выданні з фондаў Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры: матэрыялы, прысвечаныя прадстаўнікам літаратурнага аб'яднання беларусаў у Польшчы «Белавежа», а таксама жыццю беларусаў у Латвіі.

✓ **27 чэрвеня** ў Рэспубліканскай мастацкай галерэі «Палац мастацтва» адбылося адкрыццё трох выставак: **мемарыяльная выстаўка Вячаслава Дубінкі «Я проста ў далёкай вандроўцы»**, прысвечаная 70-годдзю з дня нараджэння мастака; **персанальнай выстаўкі заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь Уладзіміра Уродніча «Я сегодня до зари встану...»**, а таксама – **персанальнай выстаўкі Аляксандра Малея «Экзістэнцыя. Спосаб быцця чалавечай асобы»**, прысвечанай 60-годдзю мастака.

Усе выстаўкі працуюць да 15 ліпеня штодзень акрамя панядзелка.

✓ **29 чэрвеня** ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа адбыўся **ўшанавальны вечар «патрыярха беларускай філасофіі» Уладзіміра Конана**, які пайшоў ад нас год таму. На сустрэчы прысутнічалі калегі, аднадумцы, сябры У. Конана: сацыёлаг, культуролаг, доктар філасофскіх навук Энгельс Дарашэвіч, доктар філалагічных навук Арсень Ліс, літаратуразнаўца Аляксей Рагуля, мастак-плакатыст Уладзімір Крукоўскі, а таксама землякі і сваякі славутага вучонага.

✓ **29 чэрвеня** ў Маладзечне адбылася **творчая сустрэча з лідарам гурта «Палац» Алегам Хаменкам**. У праграме мерапрыемства адбыліся цікавая размова, акустычны канцэрт, конкурсы з падарункамі ад кампаніі «Рок-салідарнасць».

"Краязнаўчая газета". На тым тыдні…